Нашы інтэрв'ю

# СТУДЭНТ— ЗНАЧЫЦЬ ПРАЦАЎНІК

Вядома, што ад правільнай арганізацыі працоўнага дня ў многім залежыць поспех на экзаменах. Пытанне «Як усё паспець?» адлюстроўвае праблему не толькі студэнтаў. І калі старшакурсніка яно хвалюе больш у сэнсе часу, то зайздросны першакурснік яшчэ і здзіўляецца: «Як ён паспеў столькі пазнаць? Мусіць, у гэтай справе ёсць які-небудзь сакрэт?»

Адказаць на гэтыя пытанні я папрасіў ленінскага стыпендыята старасту III курса юрыдычнага факультэта **Віктара Будкова**.

— Сакрэт ёсць, калі сілу волі лічыць сакрэтам—прадумаць заданні, якія трэба будзе выканаць, час і магчымасць іх выканання, скласці на гэтай падставе рацыянальны распарадак дня. І ні ў якім разе не адхіляцца ад гэтай праграмы. Мала часу? А эканомія? Не эканомлю я толькі на адпачынку.

**— А па якой сістэме вы рыхтуецеся да сесіі?**

— Гэта сістэма таксама вядома ўсім: штодзённыя лекцыі, сістэматычная падрыхтоўка да практычных заняткаў, і перад экзаменам застаецца толькі паўтарыць матэрыял. Усё гэта — пры цвёрдай самадысцыпліне. Дадам яшчэ, што ў час падрыхтоўкі я стараюся разгледзець тое ці іншае пытанне як мага глыбей за кошт дадатковай літаратуры.

**— Пэўна, вы чытаеце ўсю рэкамендаваную дадатковую літаратуру?**

— Так, я заўсёды настроен на тое, каб высветліць, як тлумачыцца гэта ці іншае пытанне ў другім дапаможніку. А калі зрабіць гэтага нельга (часам спіс дадатковай літаратуры занадта вялікі), стараюся хаця б на гэты дзень прагледзець яе, ці дачытаць у час непасрэднай падрыхтоўкі да экзамена.

**— Чым захапляецеся вы, акрамя вучобы?**

— Зараз вучуся друкаваць на пішучай машынцы. У маёй будучай рабоце гэта спатрэбіцца. Наогул я і тут прытрымліваюся правіла: вучыцца толькі таму, што табе патрэбна зараз ці спатрэбіцца ў будучым. Усякую іншую трату часу лічу злачынствам.

**— Прабачце, а кіно, тэатр? Гэта таксама дарэмная трата часу?**

— Вядома, не! У маім распарадку дня субота — дзень наведання тэатра, а нядзеля — кіно. Праўда, бываюць і выключэнні, калі ў кіно ці тэатр я хаджу і ў іншыя дні, але тады парушаецца парадак майго рабочага дня. А вучоба гэтага не церпіць.

**— Цікава, ці хвалюецеся вы перад экзаменам?**

— Ды як! Гэта ж выпрабаванне не толькі ведаў, але і сумлення. Па-другое, я — студэнт!

**— Што б вы параілі першакурсніку?**

— Цяжка раіць штосьці канкрэтнае, бо кожны студэнт мае свае псіхалагічныя, фізічныя і іншыя асаблівасці. Скажу толькі: «Студэнт— гэта значыць працаўнік».

**Г. АКІМОВІЧ.**

# ШЧАСЛІВАЯ САДРУЖНАСЦЬ

**На сумесным пасяджэнні прадстаўнікоў дэканата, партбюро, прафбюро, камітэта камсамола гістарычнага факультэта падведзены вынікі факультэцкага конкурсу на лепшую акадэмічную групу. Пераможцай прызнана група пятага курса аддзялення філасофіі (куратар старшы выкладчык, кандыдат філасофскіх навук А. Г. Кляцкоў, староста Г. Рагодчанка, камсорг Н. Сарокіна, прафорг Я. Тумiловіч).**

Пяты год крочыць дружны студэнцкі калектыў па дарогах навукі і ўвесь гэты час ён служыць прыкладам у вучобе. Летнюю экзаменацыйную сесію чацвёра студэнтаў здалі толькі на выдатна, а Святлана Калбаска вось ужо пяты год выдатніца.

Добрай вучобе садзейнічае і ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Вясной 14 чалавек выступілі з дакладамі на XXX студэнцкай канферэнцыі БДУ. Ігар Дубінін і Ігар Шыршоў удзельнічалі ў рабоце Маскоўскай і Ленінградскай усесаюзных канферэнцый і атрымалі дыпломы I і II ступені. Уладзімір Лукашэвіч быў удзельнікам сімпозіума ў Сафіі, прысвечанага праблемам міжнароднага маладзёжнага руху.

Грамадская работа — неад'емная частка студэнцкага жыцця кожнага члена групы. Людміла Маркоўская, напрыклад, — намеснік старшыні прафкома БДУ, Уладзімір Лукашэвіч — дэкан грамадскіх падрыхтоўчых курсаў, Ірына Жвалеўская узначальвала работу камітэта камсамола факультэта. А яшчэ прапагандысцкая дзейнасць (кожны прачытаў мінімум па дзве лекцыі на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, у школах), удзел у мастацкай самадзейнасці, спорце, працоўным семестры (6 студэнтаў былі байцамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў). Словам, ва ўсіх ёсць справа.

Гонар лічыцца лепшай акадэмічнай групай заваяван пастаянай, напружанай працай кожнага члена калектыву.

Хочацца ад усёй душы павіншаваць пераможцаў.

Праз некалькі месяцаў яны абароняць дыпломы і выйдуць на самастойную жыццёвую дарогу. Няхай жа дружба, загартоўка, якія яны набылі ў сваёй групе, дапамогуць пераадолець у жыцці любыя цяжкасці і перашкоды.

**Т. ЛЕАНКОВА.**





Лекцыю па эканамічнай геаграфіі студэнтам IV курса чытае ст. выкладчык **Л. А. Паўловіч**.

Фота **Д. Чаховіча**.

МАЕ НАСТАЎНІКІ

# ЧАЛАВЕК ДОБРАЙ ДУШЫ

На філалагічным факультэце вельмі добра ведаюць гэтую светлавалосую жанчыну з ласкавым позіркам вачэй, дацэнта кафедры рускай савецкай літаратуры, кандыдата філалагічных навук Веру Анісімаўну Захараву.

Дваццаць год свайго жыцця аддала яна навуцы і студэнцтву. За плячыма нялёгкі жыццёвы шлях.

Закончыўшы на выдатна школу, яна паступіла ў Ленінградскі універсітэт. Але толькі скончыла першы курс, як пачалася вайна. Дзевятнаццацігадовую дзяўчыну накіравалі працаваць у шпіталь, які знаходзіўся тут жа, у Ленінградзе. Усё прыйшлося перажыць — і бамбёжкі, і холад, і голад.

У самым канцы вайны шпіталь «перакінулі» на другі Беларускі фронт. З баямі прайшлі Варшаву, усю Усходнюю Прусію і толькі 120 кіламетраў не дайшлі да Берліна. Колькі параненых выцягнула яна з-пад фашысцкіх куль, колькім байцам захавала жыццё. За баявыя заслугі Вера Анісімаўна Захарава ўзнагароджана пяццю медалямі і ордэнам Чырвонай Зоркі.

У 1943 годзе яе прынялі ў рады Камуністычнай партыі.

Дзяўчына марыла вучыцца. У 1948 годзе Вера Анісімаўна заканчвае Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава, а ў 1953 годзе — аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. З поспехам абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Народная паэзія ў аўтабіяграфічных творах А. М. Горкага». Усе гэтыя гады яна працавала нястомна і ўпарта. У 1953 годзе ёй была прысвоена ступень кандыдата філалагічных навук.

Цяпер Вера Анісімаўна чытае лекцыі, вядзе семінары, кіруе дыпломнымі і курсавымі работамі, узначальвае фальклорную практыку студэнтаў. Заўсёды падкажа, дзе і якую літаратуру можна ўзяць, як пачынаць работу, накіруе на асноўную думку, дапаможа разабрацца ў многіх пытаннях.

Вера Анісімаўна многа год была сакратаром партыйнага бюро, зараз узначальвае групу народнага кантролю. У гэтым годзе пад яе рэдакцыяй быў выдадзен зборнік «Фальклор у сучасных запісах».

Але не толькі як калегу, як добрага навуковага работніка ведаюць Веру Анісімаўну Захараву. Яе ведаюць як чалавека цудоўнай душы, адкрытай людзям, як таварыша і сябра. З ёю прыемна пагутарыць аб усім: аб сучасных падзеях, паэзіі, каханні. Яна вельмі тонка адчувае псіхалогію чалавека.

Вера Анісімаўна патрэбна людзям, і гэта галоўнае.

**А. РУЛЕВА,**
**студэнтка.**

# ПРЫСВЯЦІЦЬ СЯБЕ НАВУЦЫ

**Гістарычны факультэт займае першае месца па паспяховасці. Тут кожны сёмы — выдатнік вучобы, амаль усе ўдзельнічаюць у студэнцкім навуковым таварыстве.**

**Дарэчы, на гістфаку лічаць, што СНТ дае невычэрпныя рэзервы для паспяховай вучобы, раскрывае творчыя магчымасці студэнтаў. А гэта вельмі неабходна для фарміравання спецыяліста. Менавіта аб СНТ ішла гутарка нашага карэспандэнта з дэканам факультэта Іраідай Осіпаўнай Царук.**

**— Іраіда Осіпаўна, якую ролю, на Вашу думку, адыграюць СНТ у падрыхтоўцы спецыялістаў і як гэта выглядае ў межах вашага факультэта?**

— Мне здаецца, што кожны чалавек, які пераступае парог вышэйшай навучальнай установы, павінен зразумець, што для яго пачынаецца карпатлівая разумовая праца — праца над сабой, уласным светапоглядам. У гэтым яму дапамагаюць вопытныя выкладчыкі, працы класікаў марксізму-ленінізму, практычныя заняткі, спрэчкі, гутаркі... Усё гэта важна і неабходна, але не менш карысным з'яўляецца ўдзел у СНТ. Тут кожны атрымлівае магчымасць «уласнымі рукамі» узяць усё неабходнае, выпрацаваць асабістую навуковую думку і выказаць яе, працуючы над пэўнай тэмай. Мне здаецца, што студэнт гістарычнага факультэта не мае ніякага маральнага права не займацца навуковай працай, таму што ён перш за ўсё — ідэалагічны баец.

Не дзіўна таму, што фактычна кожны студэнт нашага факультэта рана ці позна прыходзіць у СНТ. І не толькі са стацыянара, а таксама і з вячэрняга аддзялення і завочнага факультэта. Вопытныя выкладчыкі імкнуцца абудзіць у студэнтаў жаданне адправіцца ў навуковы пошук, напісаць навуковую работу, даклад, рэферат. Мяркуйце самі: толькі да 50-годдзя ўтварэння СССР больш як 200 чалавек выступіла з лекцыямі перад рабочымі, калгаснікамі, школьнікамі.

Але ў СНТ залічваюцца толькі тыя, хто не менш як два-тры разы выступіць перад аўдыторыяй. Думаецца, што такая пастаноўка работы СНТ дае магчымасць рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**— Раскажыце, калі ласка, якое месца сярод навуковых работ студэнтаў вашага факультэта займаюць працы па гісторыі ВЛКСМ і праблемах міжнароднага маладзёжнага руху!**

— Жадання пісаць навуковыя работы па гэтых тэмах студэнтам не займаць, ды гэта зусім зразумела. Таму кожны, акрамя тэм, прапанаваных на кафедры, можа ўзяць уласную. На факультэце ў апошнія гады для больш глыбокага вывучэння маладзёжнага руху арганізаваны гурткі, чытаюцца спецкурсы і наладжваюцца карысныя сустрэчы. Акрамя гэтага, існуюць дагаворы аб абмене студэнтамі і выкладчыкамі з Сафійскім, Ягелонскім, Іенскім універсітэтамі.

Многія навуковыя работы перарастаюць у дыпломныя. Ды што дыпломныя! Толькі ў апошні час абаронены кандыдацкія дысертацыі Уладзімірам Ладысевым і Ірынай Каменскай. Тэмы іх вельмі блізкія да яшчэ студэнцкіх навуковых работ. Працуюць над кандыдацкімі дысертацыямі па праблемах маладзёжнага руху і іншыя выпускнікі.

**— Пры поўным ахопе ўсіх студэнтаў навуковай работай, відаць, немалаважнай застаецца арганізацыя яе на факультэце! Цікава таксама, якія здабыткі ў СНТ гістфака!**

— Сапраўды, ад арганізаванасці залежыць многае. У нас кожны студэнт замацаван за той ці іншай кафедрай і займаецца ў кафедральным гуртку, які распрацоўвае пэўнае кола тэм. Так, у гуртках пры кафедры гісторыі СССР займаецца 150 чалавек, гісторыі КПСС — 119.

Існуе факультэцкі савет студэнцкага навуковага таварыства, які аб'ядноўвае ўсе гэтыя гурткі. Савет СНТ узначальвае асістэнт Леанід Лойка. Ёсць у нас і ганаровы старшыня — прафесар Л. М. Шнеерсон. На факультэце ёсць падрабязны план работы навуковага таварыства на год, дзе вызначаны даты канферэнцый, справаздач на курсах, падвядзення вынікаў. Выходзяць спецвыпускі газет, бюлетэні, «маланкі». Усё гэта дае магчымасць шырэй інфармаваць студэнтаў аб справах СНТ, натхняе на больш актыўную працу.

Толькі ў красавіцкай канферэнцыі на факультэце прымала ўдзел 188 членаў таварыства. На рэспубліканскім аглядзе-конкурсе 31 рабоце студэнтаў была прысвоена першая катэгорыя. Чатырнаццаць чалавек выязджалі ў розныя гарады краіны, дзе выступілі з дакладамі. А Яўген Лыскавец, Пётр Краўчанка, Наташа Абрамава наведалі Іенскі універсітэт у ГДР. Члены нашага СНТ прымаюць удзел у напісанні артыкулаў і для БелСЭ.

**— Што Вы лічыце асноўным у рабоце са студэнтамі ў СНТ!**

— Важна арганізаваць творчыя імкненні студэнтаў, у чым павінны, мне здаецца, адыграць немалую ролю грамадскія арганізацыі. Трэба, каб СНТ дзейнічала пастаянна, мела аўтарытэт.

Важнай формай работы СНТ з'яўляюцца справаздачы яго членаў, сходы, віншаванні.

У навуковай рабоце галоўнае — зацікаўленасць, пошук, і гэта павінна быць кірункам у рабоце студэнцкага навуковага таварыства.

**Гутарку вёў А. САЧАНКА.**



# ЗА ПЯЧАТКАМІ ПРЫРОДЫ

Любіць прыроду — гэта не толькі любавацца пейзажамі, крочачы з рукзаком за плячыма. Ахоўваць прыроду — гэта не толькі публічна асуджаць браканьераў.

Ахоўваць жа прыроду, актыўна выкарыстоўваць прыродныя рэсурсы можна толькі на аснове паглыбленага разумення працэсаў, якія адбываюцца ў акружаючым асяроддзі, колькаснай ацэнкі розных фактараў і сувязей паміж імі. У навуцы аб прыродзе цяпер складваецца тая ж сітуацыя, якая была ў малекулярнай біялогіі два дзесяцігоддзі назад. Прыродазнаўства ператвараецца з апісальнай навукі ў колькасную, а гэта азначае, што людзі блізкія да таго, каб прагназіраваць навакольнае асяроддзе на дзесяцігоддзе наперад.

Зразумела, як патрэбны народнай гаспадарцы спецыялісты, якія ўмеюць граматна чытаць кнігу прыроды, прымяняць вымяральныя і аналітычныя метады для кантролю за станам прыродных комплексаў.

У палажэнні аб студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі метралогіі прыродных сістэм пры кафедры ядзернай фізікі запісана: «СНДЛ створана з мэтай прыцягнення студэнтаў да навукова-даследчай работы ў галіне вывучэння і аховы навакольнага асяроддзя ядзернафізічнымі і электроннафізічнымі метадамі...

Гэта, другая СНДЛ на фізічным факультэце, існуе каля паўгода, але на яе рахунку ўжо нямала добрых спраў: удзел у работах па гаспадарчых дагаворах, стварэнне нізкафонавай лабараторыі і многае іншае.

На штотыднёвым семінары лабараторыі выступаюць і студэнты малодшых курсаў. Даклады другакурснікаў Алега Салаўянава, Ігара Рэнгарта, Анатоля Салюка аб вымяральных метадах у вывучэнні прыродных з'яў з вялікай цікавасцю слухалі студэнты старэйшых курсаў, выкладчыкі і супрацоўнікі кафедры, якія актыўна дапамагаюць студэнтам у навукова-даследчай рабоце: загадчык кафедры прафесар С. С. Шушкевіч, У. А. Чудакоў, О. М. Аншакоў, Г. Ф. Драб, дацэнты А. М. Зайцава, Л. М. Карэнная і іншыя. Студэнцкі даследчы калектыў чакае наваселля: у бліжэйшы тыдзень ён атрымае спецыяльна абсталяваную лабараторыю, дзе будуць размешчаны створаныя рукамі студэнтаў нізкафонавыя ўстаноўкі для вымярэння натуральнай радыёактыўнасці прыродных аб'ектаў, а таксама будуць распрацоўвацца лічбавыя вымяральна-перадаючыя сістэмы тэрміновага кантролю за станам навакольнага асяроддзя. Першыя макеты такіх сістэм былі выпрабаваны гэтым летам на палігонах Далёкага Усходу ў Прыморскім краі.

У састаў далёкаўсходняй экспедыцыі ўваходзілі трэцякурснікі Юрый Кананаў і Максім Баргман. А Ірына Прасандзеева, Аляксандр Сакалоўскі, Леанід Сыркін і іншыя паспяхова распрацоўвалі палявыя методыкі аналізу атмасферных выпаданняў на радыёактыўнасць у складзе валожынскай экспедыцыі.

Наперадзе новыя экспедыцыі. У савета СНДЛ, якім кіруюць пяцікурснікі Уладзімір Сіроцін і Мікалай Яўменчыкаў, шмат планаў, шмат нявырашаных праблем. А нявырашаныя праблемы, як вядома, самыя цікавыя.

**А. ЛЮЦКО,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук, навуковы кіраўнік СНДЛ.**
**О. ДОРТ-ГОЛЬЦ,**
**член савета, студэнтка II курса.**

# НОВАЯ КАФЕДРА

Радаснай падзеяй для беларускіх біяфізікаў з'явілася рашэнне аб арганізацыі на базе кафедры агульнай фізікі і спецыялізацыі «Радыяцыйная біяфізіка» кафедры ядзернай фізікі новага падраздзялення — кафедры біяфізікі.

Рашэнне гэтае канкрэтна абгрунтавана і своечасовае. На кафедры ядзернай фізікі біяфізічны напрамак развіваецца ўжо больш 10 гадоў. За гэты час было выпушчана больш ста спецыялістаў-біяфізікаў, якія паспяхова працуюць цяпер у многіх інстытутах АН БССР, ва універсітэце, у медыцынскім інстытуце, у інстытутах анкалогіі, мікрабіялогіі, торфа, на розных прадпрыемствах рэспублікі. Па гэтай спецыяльнасці (або сумежных з ёй) было падрыхтавана і паспяхова абаронена 8 кандыдацкіх дысертацый і адна доктарская. У дапамогу студэнтам толькі па біяфізічнай спецыялізацыі было апублікавана пяць манаграфій. Усяго ж колькасць навуковых работ, выкананых у біяфізічным напрамку, набліжаецца да двухсот. Актыўны ўдзел у навуковай рабоце прымаюць і нашы студэнты-біяфізікі. Кіруе кафедрай біяфізікі кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт А. І. Камяк.

На кафедры біяфізікі мяркуецца правядзенне навукова-даследчай работы ў наступных напрамках: біяфізіка нуклеінавых кіслот і нуклеапратэідаў, бялкоў і клетачных мембран, біяфізіка канцэрагенэзу і інш.

Актыўны ўдзел у гэтай рабоце павінны прыняць студэнты.

**В. КРОТ,**
**кандыдат біялагічных навук.**

ТАВАРЫШ ПРА ТАВАРЫША

# ПЛЁН, ЗДАБЫТЫ ПРАЦАЙ

Выдатных поспехаў дабіліся студэнты нашага універсітэта ва ўсесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ. Атрымана пяць ганаровых грамат і чатыры залатыя медалі. Два з іх выпалі на долю нашага фізфака. Работы студэнтаў Валерыя Новікава і Аляксандра Рагачова прызнаны лепшымі ў краіне. Цікава таксама і тое, што яны маюць аднаго і таго ж кіраўніка — аспіранта кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ Яўгена Іванавіча Боўбеля. Аб ім і пойдзе расказ.

Шлях ва універсітэт не быў для Яўгена такім простым, як для большасці з нас. Хоць і школу закончыў з залатым медалем, хоць і ўступны экзамен у інстытут здаў выдатна, але ўсё ж па конкурсу не прайшоў. Вырашыў вучыцца ў Мінскім тэхнікуме сувязі. Пасля яго заканчэння служыў у радах Савецкай Арміі. І толькі пасля дэмабілізацыі паступіў у БДУ на аддзяленне радыёфізікі і электронікі.

На працягу многіх гадоў вучобы быў выдатнікам, нязменным старастай курса. Пасля заканчэння універсітэта яго пакінулі працаваць на кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. Вось коратка яго біяграфія. Але як мала могуць сказаць гэтыя скупыя анкетныя радкі аб жывым чалавеку!

Яўген — мой стары сябар. Пазнаёміліся мы ў самым пачатку яго вайсковай службы. Бо служыў ён у нашым горадзе. На баскетбольнай пляцоўцы быў адным з лепшых нападаючых каманды воінскай часці. Ведалі адзін аднаго даволі добра, але нават і не здагадваліся, што збіраемся паступіць у адну і тую ж вну. Заўсёды сціплы, ён ніколі не расказваў аб тым, як цяжка рыхтавацца да экзаменаў (служба ёсць служба!), аб сваіх планах. Прыйшлося закінуць свае любімыя шахматы. Да арміі як шахматыст ён падаваў вялікія надзеі. Яшчэ школьнікам удзельнічаў у першынстве рэспублікі. Там яго і заўважыў вядомы трэнер Сакольскі, які стаў настаўнікам Яўгена ў час вучобы ў тэхнікуме. Справы ішлі добра, меў ужо кандыдацкія балы. Менавіта ў той час газета «Знамя юности» прысвяціла яму цэлую старонку пад загалоўкам «Знаёмцеся — маладыя». Але галоўнай мэтай у жыцці было іншае.

А пасля гады напружанай вучобы ва універсітэце. Амаль кожная сесія — на выдатна. Кожнае лета — у студэнцкім будаўнічым атрадзе. Як стараста карыстаўся вялікай павагай аднакурснікаў за сваю прынцыповасць. І не толькі да другіх, але і да сябе.

Пасля заканчэння універсітэта мы з Яўгенам засталіся працаваць на адной кафедры. Я бачыў, што праца для яго была працягам вучобы. Увесь вольны час праводзіў у бібліятэцы, на вылічальным цэнтры заседжваўся да ночы. Выключная мэтанакіраванасць, настойлівая творчая праца пачалі даваць вынікі. Яго даследаванні друкуюцца ў цэнтральных навуковых часопісах, паспяхова ідзе работа над дысертацыяй. І ў дадатак — вялікая грамадская праца. Камсамольская арганізацыя нашай кафедры, як паказалі вынікі спаборніцтва, падведзеныя да 56-й гадавіны Кастрычніка, з'яўляецца лепшай на факультэце. І першы штуршок ёй у гэтым напрамку даў Яўген, калі тры гады назад стаў камсамольскім сакратаром. Шэрагам канкрэтных спраў, сваім аўтарытэтам, асабістым прыкладам ён здолеў надаць нашай арганізацыі рысы жывога, ініцыятыўнага калектыву.

Вось ужо два гады Яўген — член партбюро фізфака. Гэта работа патрабуе шмат часу і энергіі. Але яму ўдаецца быць яшчэ і у курсе ўсіх культурных і, само сабой, спартыўных (старая схільнасць) навін. Нават стаў чэмпіёнам Мінска па шахматнай кампазіцыі.

Але галоўнае — гэта, канешне, праца. І надзвычайная добрасумленнасць у адносінах да ўсяго, што яе датычыць. Калі даручана кіраваць курсавой або дыпломнай работай, не шкадуе часу на абмеркаванне са сваім падапечным усіх аспектаў пастаўленай задачы, дапаможа зрабіць першыя, заўсёды самыя цяжкія крокі. Гэта добрасумленнасць, па-мойму, галоўная рыса яго характару. Як і надзвычайны энтузіязм і сапраўдны спартыўны запал да ўсяго, за што бярэцца. Таму, шчыра кажучы, я хоць і быў здзіўлен разам з усімі выдатнымі вынікамі, дасягнутымі яго студэнтамі (два медалі!), але лічу іх заканамернымі. І хачу пажадаць Яўгену далейшых поспехаў.

**М. БАТУРЫЦКІ,**
**ст. інжынер кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ.**

Матэрыялы старонкі падрыхтаваны карэспандэнцкім пунктам фізфака, які ўзначальвае асістэнт кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ Э. А. Панкрацьева.

# ПА СТАРОНКАХ НАСЦЕНГАЗЕТ ФІЗФАКА

**«ИМПУЛЬС», орган камсамольскай арганізацыі кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі.**

Карысную ініцыятыву праявіла кафедра ядзернай фізікі, арганізаваўшы сумесна з бібліятэкай лекцыю для студэнтаў, якія спецыялізуюцца пры кафедры. Галоўны бібліятэкар Р. І. Ляховіч расказала, як карыстацца даведніцка-бібліяграфічнымі, інфармацыйнымі і рэфератыўнымі выданнямі. Адначасова была наладжана выстаўка літаратуры, аб якой ішла гутарка. Студэнты мелі магчымасць на практыцы замацаваць атрыманыя веды і атрымаць адказы на цікавіўшыя іх пытанні.

**«ИСКАТЕЛЬ», II курс аддзялення радыёфізікі.**

29 кастрычніка адбыўся ўрачысты сход нашага патока, прысвечаны дню нараджэння ВЛКСМ. Перад камсамольцамі выступіла прадстаўніца першага камсамольскага пакалення Алена Анатольеўна Мар'ясіна. Яна ўспамінала. Хваліла нас і ў чымсьці дакарала, параўноўвала — усё як заўжды, але мы адчувалі сябе вінаватымі за нашых непаспяваючых, нашых «хіпнікаў». Мы радаваліся яе пахвалам сціпласці, самаадданасці, поспехам маладых.

Яна не старая камсамолка. Яна — старэйшая камсамолка. Бачыла У. І. Леніна, размаўляла з ім. Яна змагалася з ворагамі рэвалюцыі. І вось гэты незвычайны чалавек — наш госць. Мы былі ўражаны і ўдзячны Алене Анатольеўне за яе расказ аб сваім кіпучым, багатым на падзеі жыцці, якое заклікае браць прыклад.

**С. СТРЭЛАВА.**

На аддзяленні радыёфізікі размеркаванне студэнтаў па кафедрах адбываецца на III курсе, але мы вырашылі пазнаёміцца з работамі на кафедрах ужо цяпер. Былі арганізаваны сустрэчы з загадчыкам кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ прафесарам У. В. Ізохам і загадчыкам кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі прафесарам І. Р. Некрашэвічам. Вопыт гэтых сустрэч паказаў, што ўсе студэнты зацікаўлены ў больш глыбокім веданні напрамкаў работ кафедральных калектываў.

**Л. АНТОНЕНКА.**



Журналіст павінен добра валодаць не толькі пяром, але і фотаапаратам. Таму абавязкова ўсе студэнты журфака праходзяць спецыяльную падрыхтоўку па фотасправе.



**На здымку:** заняткі вядзе ст. выкладчык **Г. З. Бягун.**

Фота **Д. Чаховіча.**

## БАЛГАРЫЯ Ў ЗДЫМКАХ

По традыцыі ва універсітэце рэгулярна дэманструюцца выстаўкі, прысвечаныя жыццю балгарскага народа, яго поспехам у будаўніцтве сацыялізму, дасягненням у галіне навукі, культуры, мастацтва.

Вялікую цікавасць у студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ выклікаюць экспазіцыі да юбілейных дат. Толькі ў гэтым годзе універсітэцкі калектыў пазнаёміўся з вялікімі выстаўкамі, якія былі прысланы з Сафіі Усенародным камітэтам балгара-савецкай дружбы. Адна з іх расказвала пра выдатнага дзеяча нацыянальна-вызваленчага руху асветніка Паісія Хілендарскага. Працягвае экспанавацца выстаўка, прысвечаная балгарскаму пралетарскаму паэту Хрыста Смірненскаму, 75-годдзе з дня нараджэння якога мы нядаўна адзначалі.

Праўленне аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ запрашае студэнтаў наведаць выстаўку, экспазіцыя якой разгорнута на шостым паверсе галоўнага корпуса.

**Д. БАРЫСАЎ.**

## ВЫКЛАДЧЫКІ ВНУ — ШКОЛЕ

**Нядаўна ў адрас парткома універсітэта прыйшло пісьмо з Мінскай школы № 12 імя М. Горкага. Адміністрацыя і партыйная арганізацыя школы горача дзякуюць выкладчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі Р. І. Вадэйку, В. П. Мешчаракову, А. К. Паншынай, А. П. Ерась, М. З. Яноўскаму, М. А. Піскуновай, М. А. Беразовіну і В. П. Качанавай, якія на працягу многіх год прымалі актыўны ўдзел у рабоце школьнага універсітэта педагагічных ведаў для бацькоў.**

***

Студэнты першага курса факультэта журналістыкі правялі вялікую работу па падпісцы на газеты і часопісы на 1974 год. У гэтым немалая заслуга грамадскага распаўсюджвальніка Наташы Баўкалавай. Толькі першая група выпісала каля 64 экземпляраў газет і часопісаў.

А ўвогуле першы курс у 1974 годзе будзе атрымліваць каля 160 экземпляраў газет і часопісаў.

**А. ШЫНКЕВІЧ.**

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ

## СУСТРЭЧА З ВЕТЭРАНАМ

На ваеннай кафедры БДУ праходзіць тыдзень сустрэч студэнтаў з праслаўленымі военачальнікамі. Так, у панядзелак госцем будучых юрыстаў і фізікаў быў Герой Савецкага Саюза, генерал-лейтэнант у адстаўцы, старшыня рэспубліканскага савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Іосіф Сямёнавіч Жыгараў. Ён павіншаваў студэнтаў з надыходзячым святам — днём артылерыі, расказаў аб слаўным шляху, які прайшла наша гераічная артылерыя ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Цікавая і багатая на падзеі біяграфія самога генерала. Ён пачынаў працоўнае жыццё токарам, затым быў радавым чырвонаармейцам. Салдат, камуніст, военачальнік, І. С. Жыгараў у час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у шматлікіх аперацыях па выгнанню фашысцкіх захопнікаў.

Расказы ветэрана заўсёды з вялікай увагай, хваляваннем, удзячнасцю слухае моладзь і ў студэнцкай аўдыторыі, і ля экспазіцый музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Цікавую сустрэчу завяршыў кінафільм аб сучаснай артылерыі.

**М. БАРОДКА,**
**студэнт юрфака.**

# СТУДЭНЦКІЯ МІЛЬЁНЫ

«Баец студэнцкага будаўнічага атрада». Гэта словазлучэнне трывала ўвайшло ў наш слоўнік. Што стаіць за ім? Новыя гарады. Не, не блакітныя, а звычайныя, каменныя адна-, двух- або пяціпавярховыя. Стужкі дарог, стук вагонных колаў... Што яшчэ? Работа «да сёмага поту», адчуванне сваёй патрэбнасці.

На XI абласным злёце СБА сярод лепшых атрадаў рэспублікі быў названы «Буравеснік-73» філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Тры гады працуе «Буравеснік» у Акцябрскім раёне Гомельскай вобласці. Узначальвае яго камуніст, дэпутат райсавета, студэнтка III курса Людміла Агароднік. За паспяховае выкананне вытворчай праграмы і актыўны ўдзел у грамадска-палітычнай рабоце сярод сельскіх працаўнікоў атрад узнагароджан пераходным вымпелам ЦК ЛКСМБ і грашовай прэміяй. А на злёце намеснік старшыні райвыканкома Акцябрскага раёна ўручыў атраду Пераходны чырвоны сцяг раёна і прэмію — баян.

Атрад «Спадарожнік» гістарычнага факультэта ў гэтым годзе заняў першае месца ў Барысаўскай зоне. Аб сваіх рабятах горача і натхнёна ўмее расказаць камісар Сяргей Куніцкі.

Іх — 25, будучых гісторыкаў, філосафаў, эканамістаў. Дваццаць пяць хлопцаў і дзяўчат, якія за два гады існавання атрада добра зразумелі, што такое сапраўдная работа, на практыцы пазналі, што такое дружба, дабрата, сумленне. І ў мінулым годзе, і сёлета ехалі не за грашыма, а працаваць. «Нешта пакінуць пасля сябе» — так сфармуляваў задачу атрада Сяргей Куніцкі.

Дык што ж яны пакінулі пасля сябе? Кіламетры каналаў, 56 тысяч рублёў асвоеных капіталаўкладанняў. Добрыя ўспаміны жыхароў горада Барысава і навакольных вёсак.

Адзінаццаць год існуюць СБА рэспублікі. За гэты час асвоена 176 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў, з іх толькі ў гэтым годзе — 36 мільёнаў. Сярод 18 тысяч студэнтаў, якія прынялі ўдзел у семестры-73, былі 53 атрады нашага універсітэта. Зараз яны з гордасцю могуць сказаць, што ва ўсесаюзным студэнцкім мільярдзе ёсць і нашы тры мільёны!





Імя народнага мастака СССР З. І. Азгура шырока вядома ў Беларусі і за яе межамі. Яго скульптурныя групы ў апошнія гады ўпрыгожылі парк імя Я. Купалы і плошчу імя Я. Коласа.

Нядаўна ў літаратурным музеі Я. Купалы адбыўся творчы вечар мастака.

Са словам аб сябру выступае пісьменнік С. І. Грахоўскі.

Фота **Д. Чаховіча.**



**РЭПЛІКА**

## БАЧЫЦЬ ВОКА...

У пачатку гэтага навучальнага года вуснамі інжынера вучэбнага аддзела М. С. Нікіценкі газета паведаміла, што ва універсітэце уступіла ў дзеянне АТС на 400 абанентаў. Сапраўды, доўгачаканыя і нават прыгожыя тэлефонныя апараты паявіліся на кафедрах і ў кабінетах. Але вось ужо два месяцы на іх даводзіцца толькі глядзець. І самае прыкрае, што тэлефоны лодырнічаюць не па сваёй віне, яны гатовы працаваць і калі-нікалі здзіўляюць мелодычным званком, але гэта толькі азначае, што хтосьці невядомымі шляхамі і гераічнымі намаганнямі даведаўся пра патрэбны нумар. Спісу ж тэлефонных нумароў да гэтай пары няма! І міжволі задумваешся: няўжо скласці гэты спіс цяжэй, чым зрабіць тэлефанізацыю ўсяго універсітэта? Хто ж тут павінен раскачацца?

**І. КУРЫЛАЎ.**

# ПРАЗ ПРЫЗМУ СЭРЦА

**СТУДЭНЦКІЯ РЭЦЭНЗІІ**

Беларускі празаік Барыс Сачанка знаёмы чытачам як аўтар многіх аповесцей і апавяданняў. Шырока вядомы яго кнігі «Дарога ішла праз лес», «Барвы ранняй восені», «Зямля маіх продкаў», «Пакуль не развіднела», «Апошнія і першыя», «Аксана» і іншыя.

У мінулым годзе выдавецтва «Беларусь» выпусціла ў свет у цыкле бібліятэкі беларускай прозы выбраныя творы пісьменніка пад агульнай назвай «Дарогі». А сёлета Барыс Сачанка прапануе чытачам сваю новую кніжку прозы «Памяць». Як і ў папярэдніх творах, аўтар зноў звяртаецца да ваеннай тэматыкі. Гэта роздум пісьменніка над жыццём, успаміны апаленага вайной маленства.

Кнігу адкрывае аповесць «Чужое неба». У час Вялікай Айчыннай вайны будучы пісьменнік, тады яшчэ хлопчык, быў пагнан у Нямеччыну. Аб тым, што давялося перажыць і ўбачыць, Барыс Сачанка расказвае вуснамі героя аповесці Івана Гарапашкі, які жыве глыбокай верай у хуткае вызваленне, надзеяй вярнуцца ў родную вёску, у далёкую і разам з тым вельмі блізкую Беларусь. Менавіта аб ёй думаюць вязні доўгімі бяссоннымі начамі, мараць выйсці ранкам у поле, прайсціся з касою па светла-шызых травах...

Пісьменнік з любоўю паказвае сваіх землякоў, якія нідзе не губляюць чалавечай годнасці, застаюцца вартымі высокага звання савецкага грамадзяніна.

У новай аповесці Барыса Сачанкі зноў ярка раскрываецца яго талент апавядальніка. Тут няма надуманых сюжэтаў. Праўда, хай сабе горкая, як палын, — вось асноўнае ў творчасці празаіка. Б. Сачанка нібы пераклікаецца з Васілём Быкавым. Твор прасякнут любоўю да Радзімы, да роднай Беларусі, да людзей. Кожнае слова важкае, грунтоўнае, яго не выкінеш з радка.

Асаблівы роздум выклікае невялікае апавяданне «Ліст да маці». Стары вядомы пісьменнік — герой твора — пераглядвае занатаваныя ў блакнотах на пачатку яго літаратурнай дзейнасці падзеі, думкі, вобразы. І раптам... Ён знаходзіць пісьмо ад даўно памёршай маці, на якое так і не адказаў ці то з-за недахопу часу, ці мо таму, што адкладваў на потым, пакуль не забыўся зусім... І вось пажоўклае, з памылкамі, але шчырае, як матчына сэрца, яно ў яго дрыжачых руках. Пісьменнік прыгадаў старую, згорбленую вясковую кабету — сваю маці, яе парэпаныя рукі, якія выхавалі яго, выправілі ў жыццёвы шлях. Прыпомніў усё...

«Ліст да маці» быў прызнан лепшым творам вядомага майстра. Яго пераклалі на розныя мовы. Пісьмом захапляліся, над ім плакалі. Не чытала ліст толькі маці пісьменніка, якая заўсёды яго чакала.

У сваіх творах Барыс Сачанка вядзе шчырую размову з чытачом. Яго аповесці, апавяданні чытаеш з цікавасцю і хваляваннем. Героі пісьменніка заклікаюць ненавідзець вайну, любіць Бацькаўшчыну, з павагай адносіцца да мінулага свайго народа, быць на быстрыні сучаснага жыцця.

**В. ЗАДАЛЯ.**

## Паэтычны куток

**Мікола АНТАНОЎСКІ**

### ПЕСНЯ

Далёка, над нёманскай кручай,
Дзяўчына аб шчасці пяе.
Далёка, праз вёрсты, праз пушчы
Даносіцца голас яе.

Пра радасць, жыццёвую прагу
Да сонца і ззяючых зор;
Пра тых, хто сваёю адвагай
Баронячы край наш, памёр.

...Курыцца туман на світанні,
Над помнікам звоняць бары,
Купаюцца звонкія кані
У промнях барвовай зары.

А голас знаёмы, пявучы.
Душу разлагодзіў маю.
З дзяўчынай, над нёманскай кручай,
Я песню аб шчасці пяю.

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 17809 Зак. 1337